* * *

Бабруйскі аэраклуб скончыў Барыс Іванавіч Коўзан лётчык-знішчальнік, удзельнік абароны Гомеля. Двойчы Герой Савецкага Саюза. У 1940 г. ён скончыў Адэскую авіяцыйную школу. На фронце з 1941 г. Адзіны ў свеце лётчык, які тараніў 4 варожыя самалёты: 29.10.1941 г. над г. Зарайск Маскоўскай вобласці, 22.2.1942 г. над г. Таржок Калінінскай вобласці, 9.7.1942 г. над г. п. Дзямянск Наўгародскай вобласці, у жніўні 1943 г. каля г. Старая Руса. Зрабіў 360 баявых вылетаў, правёў 127 паветраных баёў, збіў 28 самалётаў праціўніка.

## Знакамітыя ўрачы

Вялікі ўклад у развіццё сістэмы медыцынскага абслугоўвання насельніцтва горада ўнеслі шырока вядомыя ўрачы У. В. Марзон і М. А. Хазанаў.

**МАРЗОН Уладзімір Восіпавіч** [7(19)11.1881, мяст. Заслаўе Мінскага пав. — 6.9.1954], беларускі вучоны ў галіне хірургіі. Прафесар (1935), заслужаны дзеяч навукі БССР (1939), заслужаны ўрач БССР (1948). Скончыў медыцынскі факультэт Юр'еўскага універсітэта (1911). Урач у Бабруйскім павеце і Бабруйску (1911—34). Загадчык кафедры аперацыйнай хірургії і тапаграфічнай анатоміі Віцебскага медыцынскага інстытута (1934—41). Удзельнік Айчыннай вайны. У 1943—49 у наркамаце (з 1946 міністэрстве) аховы здароўя БССР. Загадчык кафедры агульнай хірургіі (з 1948) Беларускага інстытута ўдасканалення ўрачоў, дырэктар гэтага інстытута (1949—54). Асноўныя працы па пытаннях хірургічнага лячэння органаў брушной поласці, гінекалагічных і уралагічных хвароб. Старшыня праўлення навуковага таварыства хірургаў БССР (1947—54). Дэпутат Вярхоўнага Савета БССР 2—3-га склікання. Узнагароджаны 2 ордэнамі Леніна, 2 іншымі ордэнамі, медалямі. Імем Марзона названа Бабруйская гарадская бальніца.

**ХАЗАНАЎ Майсей Анісімавіч** [10(22).2.1887, Вільня — 21.12.1964], беларускі вучоны ў галіне неўрапаталогіі. Доктар медыцынскіх навук (1934), прафесар (1933). Скончыў Бернскі універсітэт (1913). Загадчык павятовага аддзела аховы здароўя ў Бабруйску (1918—24). У 1924—34 у клініцы нервовых хвароб Мінскага медыцынскага інстытута. Дырэктар і адначасова загадчык кафедры нервовых хвароб Віцебскага медыцынскага інстытута. Навуковыя працы па этыялогіі, патагенезу, лячэнню поліяміэліту, эпідэміялогіі і клініцы энцэфалітаў, нейратаксікозаў і прафесійных шкоднасцей. Узнагароджаны 2 ордэнамі, медалямі.



Будынак першай савецкай бальніцы.